

# МЫ – АДЗІНАЕ ЦЭЛАЕ

***Дзень народнага адзінства – значнае і знакавае для кожнага беларуса свята, сімвал незалежнасці, самадастатковасці, яднання нацыі і пераемнасці пакаленняў. Гэта самае маладое дзяржаўнае свята нашай краіны, якое мы адзначаем у трэці раз. Яно толькі пачынае ўкараняцца ў наша жыццё, напаўняцца сэнсам і зместам, разуменнем, што мы адзіныя ў сваім выбары і разам будуем моцную, суверэнную, квітнеючую краіну.***



На працягу тыдня напярэдадні 17 верасня і ў сам гэты дзень па ўсёй Беларусі праходзілі шматлікія разнапланавыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня народнага адзінства. Да многіх з іх далучыліся і машэраўцы.

***

11 верасня прадстаўнікі нашага ўніверсітэта сталі ўдзельнікамі маштабнай патрыятычнай акцыі «Сімвал Адзінства», ініцыятарам і арганізатарам правядзення якой выступіла рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Патрыёты Беларусі». Так, калектыў і студэнты ВДУ на чале з рэктарам Валянцінай Багатыровай прынялі ўдзел у адкрыцці абласной Алеі Адзінства. Пасля чаго адбылася сустрэча лідэраў грамадскай арганізацыі «Патрыёты Беларусі» са студэнцкім актывам універсітэта. Так-сама ў гэты дзень у актавай зале галоўнага корпуса нашай установы вышэйшай адукацыі прайшоў грамадзянска-патрыятычны форум «У адзінстве наша сіла».

***

13 верасня калектыў універсітэта напісаў рэспубліканскую дыктоўку да Дня народнага адзінства.

**Працяг на 2-й стар.**

# МЫ – АДЗІНАЕ ЦЭЛАЕ




**Прадаўжэнне.**
**Пачатак на 1-й стар.**

Тэкст «Гісторыя сведчыць» быў прысвечаны гістарычным падзеям, звязаным з вызваленнем і яднаннем беларускага народа 17 верасня 1939 года. А прадыктавала яго на ўсю краіну першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі – 2023 Алена Стэльмах. У акцыі прынялі ўдзел рэктар Валянціна Багатырова, прарэктары, кіраўнікі аддзелаў, выкладчыкі і супрацоўнікі ВДУ, а таксама студэнты трэцяга курса факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый на чале з намеснікам дэкана па выхаваўчай рабоце Анастасіяй Берасневай.

***

У гэты ж дзень у рамках Адзінага дня інфармавання на тэму «Адзінства беларускага народа – асноўны фактар захавання і ўмацавання суверэнітэту і незалежнасці краіны» у ВДУ адбылася інфармацыйная сустрэча з галоўным спецыя-лістам аддзела ідэалагічнай работы, па справах моладзі, рэлігій і нацыянальнасцей галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Святаславам Міхайлавым. Падчас свайго выступлення Святаслаў Ігаравіч прывёў гістарычныя прыклады беларускага адзінства, расказаў аб пасляваенным аднаўленні краіны і адзначыў, якія савецкія дасягненні знайшлі сваё прадаўжэнне ў суверэннай Беларусі.

***

14 верасня калектыў ВДУ далучыўся да прамой трансляцыі канферэнцыі «Дзяржаўная палітыка ў сферы гісторыі: праблемы і перспектывы захавання гістарычнай праўды і памяці», якая ў нашай краіне праводзілася ўпершыню. Выкладчыкі і студэнты факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый (спецыяльнасцей «Гістарычная адукацыя» і «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны»), выкладчыкі і дэканы іншых факультэтаў, прарэктары і супрацоўнікі ўніверсітэта сабраліся ў канферэнц-зале і ў рэжыме анлайн далучыліся да пленарнага пасяджэння канферэнцыі. Далей праца навуковага форуму працягнулася на трох профільных секцыях, дзе абмяркоўваліся пытанні навукова-тэарэтычнага і ідэалагічнага забеспячэння рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, а таксама яе рэалізацыі ў сістэме адукацыі. Асабісты ўдзел у працы адной з секцый прынялі дэкан ФГіМК Сяргей Нікалаенка і загадчык кафедры гісторыі і культурнай спадчыны Анатоль Дулаў.

***

15 верасня ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі на адкрыцці выставы «Гонар за Беларусь» машэраўцы прадставілі важнейшыя дасягненні нашага ўніверсітэта, навукова-тэхнічныя распрацоўкі, матэрыялы па патрыятычным выхаванні, а таксама творчыя работы, выкананыя супрацоўнікамі мастацка-графічнага факультэта. На мерапрыемстве прысутнічалі першы прарэктар ВДУ Андрэй Механічаў, прарэктар на навуковай рабоце Яўгеній Аршанскі, загадчык аспірантуры Васіль Нарушэвіч і загадчык аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю Наталля Байдо.

***

З 14 верасня ва ўсіх кінатэатрах краіны пачаўся паказ гістарычнай драмы «На іншым беразе» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». У стужцы расказваецца аб жыцці людзей у Заходняй Беларусі, далучанай Рыжскім мірным дагаворам да Польшчы.

Многія студэнты, ліцэісты, выкладчыкі і работнікі ВДУ імя П.М. Машэрава ўжо паспелі азнаёміцца з кінакарцінай. Так, напрыклад, для сумеснага прэм'ернага прагляду стужкі кінатэатр «Мір» наведаў працоўны калектыў універсітэта на чале з рэктарам Валянцінай Багатыровай.

Дайджэст мерапрыемстваў «Тыдня адзінства» глядзіце з дапамогай QR-кода.

***

17 верасня студэнты, ліцэісты, выкладчыкі і супрацоўнікі ВДУ выступілі арганізатарамі і ўдзельнікамі патрыятычнай акцыі «Мы – адзінае цэлае», да якой далучыліся і прадстаўнікі іншых віцебскіх устаноў вышэйшай адукацыі. Фінальным акордам мерапрыемства стаў сімвалічны флэшмоб на галоўным стадыёне нашага ўніверсітэта. У гэты ж дзень машэраўцаў чакаў турыстычны злёт, прымеркаваны да Дня народнага адзінства, які праходзіў на базе турыстычна-аздараўленчага комплексу «Лосвіда».

Машэраўцы падзяліліся сваімі ўражаннямі ад гэтага насычанага дня.

**Святлана КАСЦЮКОВА,**
**прарэктар па выхаваўчай рабоце ВДУ:**

– Дзень народнага адзінства наш універсітэт адсвяткаваў з асаблівым размахам. Былі праведзены тры знакавыя мерапрыемствы, у якіх прынялі ўдзел прадстаўнікі рэктарата, супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты. Спачатку адбылася патрыятычная акцыя, якая пачалася з выступу рэктара ВДУ імя П.М. Машэрава Валянціны Васільеўны Багатыровай. Яна расказала прысутным гісторыю з'яўлення свята 17 верасня. Завяршылася мерапрыемства абдымкам дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь усімі ўдзельнікамі акцыі ў выглядзе карты нашай краіны. Затым машэраўцы сталі ўдзельнікамі памятнага мітынгу на тэрыторыі мемарыяла «5-ы полк», падчас якога ўшанавалі памяць тых, хто загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Таксама трэба адзначыць маштабнасць турыстычнага злёту, які ўразіў мяне згуртаванасцю ўсяго нашага калектыву і дружалюбнай атмасферай. Усё прайшло выдатна і займальна, студэнты былі арганізаваныя, уважлівыя і падтрымлівалі адзін аднаго падчас конкурсаў. А песні каля вогнішча аб'ядналі нас яшчэ мацней. Безумоўна, такія мерапрыемствы – гэта цудоўная магчымасць зразумець кожнаму з нас, што толькі разам, стаўшы адзіным цэлым, адзінай сям'ёй Машэраўцаў, мы зможам вырашаць дзяржаўныя задачы і ствараць светлую будучыню.






**Алена КУНЦЭВІЧ,**
**намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце ФХБіГН:**

– Турыстычны злёт праходзіў у значнае для нашай краіны свята – Дзень народнага адзінства. Безумоўна, гэта і стала галоўнай ідэяй мерапрыемства, дзякуючы якому кожны з прысутных змог адчуць сябе часцінкай цэлага: цэлага факультэта, цэлага ўніверсітэта, цэлай краіны. Акрамя аб'яднальнага пачатку турзлёт даў магчымасць нашым студэнтам, асабліва першакурснікам, раскрыць свае таленты, бліжэй пазнаёміцца і пасябраваць з аднакурснікамі, каб у далейшым шчыра і ярка пражыць студэнцкае жыццё. Хлопцы і дзяўчаты творча падышлі да конкурсу візітак, з азартам удзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах, з душой спявалі песні каля вогнішча. Яны паказалі, што адпачываць умеюць выдатна і, думаю, працаваць будуць гэтак жа. Мерапрыемства паспрыяла таму, каб наш дружны калектыў яшчэ раз усвядоміў, што толькі разам мы можам ставіць новыя мэты і імкнуцца іх дасягаць.

**Кацярына КАЧАН,**
**студэнтка 4 курса ФСПіП:**

– 17 верасня – гэта свята, якое адгукаецца ў нашых сэрцах. Асабліва прыемна ўсведамляць, што ва ўсіх мерапрыемствах, што праходзілі ў Дзень народнага адзінства, а таксама напярэдадні яго, прынялі ўдзел шмат неабыякавых людзей, сапраўдных патрыётаў, для якіх гэта свята на самой справе мае вельмі важнае значэнне. Маштабная акцыя на стадыёне, мітынг і ўскладанне кветак да мемарыяльнага комплексу «5-ы полк», турыстычны злёт – усё гэта пакінула ў кожнага з нас светлы адбітак. Цудоўна, што такі важны дзень для нашай краіны машэраўцы мелі магчымасць правесці менавіта так і ўсе разам.

**Антон БУЛЫНЯ,**
**студэнт 1 курса ЮФ:**

– Мне вельмі спадабалася прымаць удзел ва ўніверсітэцкім турыстычным злёце. Для кожнага з нас гэта была цудоўная магчымасць пазнаёміцца з новымі людзьмі, набыць сяброў, а таксама паўдзельнічаць у конкурсе візітак, спартыўных спаборніцтвах, убачыць паказальныя выступленні вайскоўцаў 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады, пасмажыць мяса на вогнішчы, паспяваць песні. Мы адчувалі сябе адной вялікай сям'ёй. За гэта мне хацелася б падзякаваць усім арганізатарам, якія зрабілі гэты дзень незабыўным.

**Іслам СРАШОЎ,**
**студэнт 3 курса ФНЗГ:**

– Патрыятычна, весела і вельмі смачна – менавіта так я б апісаў усё тое, што адбывалася 17 верасня на беразе цудоўнага возера Лосвіда падчас турыстычнага злёту, удзельнікам якога мне пашчасціла стаць. На гэтым маштабным мерапрыемстве мне асабліва спадабаўся конкурс візітак, да падрыхтоўкі якога мы, студэнты факультэта навучання замежных грамадзян, падышлі вельмі адказна. Прызнацца, я хваляваўся, што не ўсё атрымаецца, але ў выніку ўсё прайшло добра. Асобна хацелася б адзначыць беларускія і кітайскія стравы, а таксама смачную травяную гарбату ад факультэта хіміка-біялагічных і геаграфічных навук, якая мне вельмі спадабалася. На гэтым мерапрыемстве мне ўдалося пазнаёміцца з актыўнымі, пазітыўнымі, адкрытымі і дабрадушнымі беларускімі студэнтамі. І калі б мне яшчэ раз прапанавалі паўдзельнічаць у такім турзлёце, я б, безумоўна, пагадзіўся.

**Ягор КУЗНЕЧЫК,**
**навучэнец 11 «М» класа Ліцэя ВДУ:**

– Па-першае, турыстычны злёт мне запомніўся тым, што нам пашанцавала з надвор'ем. Па-другое, насычанай праграмай: конкурс візітак, выступленне вайскоўцаў, песні каля вогнішча, цудоўная атмасфера і многа пазітыўных эмоцый – у гэты дзень я адчуваў сябе часткай вялікай і дружнай сям'і Машэраўцаў. Асаблівыя і невымоўныя ўражанні ў мяне засталіся і пасля наведвання мемарыяльнага комплексу «5-ы полк», дзе я пабываў упершыню. Наогул, мне вельмі спадабалася, як я правёў гэты святочны дзень. 17 верасня для мяне – пачуццё адзінства з кожным, хто знаходзіўся побач. Вялікі дзякуй рэктару ВДУ Валянціне Васільеўне Багатыровай за цудоўную магчымасць далучыцца нам, ліцэістам, да такога маштабнага святкавання гэтага значнага для нашай краіны дня.

**Вікторыя АЛЯКСАНДРАВА.**
**Фотаздымкі**
**Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж з турзлёту глядзіце з дапамогай QR-кода.



